ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч М. К. Грыцэнка**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 4 клас

## *Практыкум*

*Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання*

Мінск
«Сэр-Віт»
2024

# АД АЎТАРАЎ

***Шаноўны сябар!***

Чацвёрты год навучання – гэта фундамент тваіх ведаў для далейшага паспяховага вывучэння беларускай мовы.

Дапаможнік, які мы падрыхтавалі для цябе, дазволіць пазнаёміцца з творамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, пашырыць свой слоўнікавы запас, развіць вусную і пісьмовую мову.

Практыкаванні і заданні накіраваны на тое, каб дадаткова пазаймацца па пройдзенай тэме, адпрацаваць арфаграфічныя навыкі, самастойна ці пад кіраўніцтвам настаўніка выканаць заданні. Многія заданні суправаджаюцца сістэмай пытанняў, якія спрыяюць арганізацыі паўтарэння на працягу ўсяго курса вывучэння мовы.

Пасля кожнай тэмы ты зможаш праверыць свае веды ў рубрыцы «Правер сябе».

***Жадаем поспехаў у вывучэнні роднай мовы!***

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў 3-м КЛАСЕ

***Памятай!*** Словы складаюцца з гукаў і літар. Гукі мы чуем і вымаўляем, з дапамогай літар запісваем слова і чытаем яго: [с’адз’эл’і] – сядзелі.

Словы падзяляюцца на склады: до-бры-я.

У слове можна выдзеліць канчатак, корань, прыстаўку і суфікс:

прыдаро**ж**н ы .

Частка слова без канчатка – гэта аснова.

**1.** Вызначы прыстаўкі ў словах.

Прыбег, падскочыў, адплыў, рассыпаў, абвёў, надрэзаў, аб’явіў, успомніў, узрыхліў, разбіў, паплылі.

***Памятай!*** Прыстаўкі ***аб-***, ***ад-***, ***пад-***, ***над-***, ***прад-***, ***перад-*** пішуцца нязменна.

Правапіс прыставак на ***з-***, ***с-*** (***без-***, ***бяз-***, ***бес-***, ***без-***, ***с-***, ***з-***, ***уз-***, ***ус-***) залежыць ад першага гука кораня. Калі корань пачынаецца з глухога зычнага, у прыстаўцы пішам літару ***с***, калі са звонкага – ***з***.

**2.** Устаў прапушчаныя літары, абазнач прыстаўкі.

А..вясціў, ра..хвалявалася, па..рыхтаваў, на..рэзаў, у..помніў, б**я**..хмарнае, б**е**..дакорны, пра..казаў, у..лесак, ра..плёў.

✶ Растлумач правапіс выдзеленых літар.

✶ Запішы некалькі сказаў, каб атрымаўся тэкст-апавяданне. Карыстайся схемай.

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

*Схема пабудовы тэксту-апавядання:*

пачатак падзей, дзеяння;
развіццё падзей, дзеяння;
заканчэнне падзей, дзеяння.

**3.** Прачытай сказы. Ці могуць яны з'яўляцца тэкстам?

____________________

Падарылі мне шчаня. Я назваў яго Бой. Мой шчанюк такі ласкавы, добры! На спі́не ў яго чорная плямка.

Аднойчы вывеў я Боя на вуліцу пагуляць. Раптам ён убачыў суседскага ката.

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

✶ Ці ёсць тут усе часткі, каб лічыць гэта тэкстам? __________

✶ Якіх частак не хапае? ____________________

## *Правер сябе*

**1.** Адзнач «✓» правільнае, на тваю думку, прадаўжэнне выказвання.

Аснова слова – гэта ...

☐ корань і канчатак;

☐ усё слова без канчатка;

☐ прыстаўка і корань.

**2.** Адзнач «✓» радок, у якім усе словы маюць канчатак ***-я***.

☐ Малыя, горкія, доўгія, зямля.

☐ Чысціня, скрыня, добрая, нядзеля.

☐ Бабуля, вішня, чарэшня, дабрыня.

**3.** Ад чаго залежыць канчатак у слове? Адзнач «✓».

☐ Ад прыстаўкі;

☐ ад гука, на які заканчваецца аснова;

☐ ад кораня.

**4.** Адзнач «✓» радок, у якім аснова ў словах заканчваецца на цвёрды зычны гук.

☐ Паветра, замаразкі, падпіска.

☐ Паветра, санкі, медзь.

☐ Песенька, работа, марозны.

## Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі



***Памятай!*** Калі назоўнік 2-га скланення мужчынскага роду адказвае на пытанне *хто?*, то ён мае аднолькавыя канчаткі ў формах роднага і вінавальнага склонаў: няма (*каго?*) вучн**я**, бачу (*каго?*) вучн**я**.

Калі назоўнік адказвае на пытанне *што?*, то мае аднолькавыя канчаткі ў формах назоўнага і вінавальнага склонаў: ёсць (*што?*) вецер□, бачу (*што?*) вецер□.

**1.** Вызначы род назоўнікаў. Запішы іх згодна з асновай у табліцу. Праскланяй.

**Гушчар, мядзведзь, мароз, дом, чалавек, пень, конь, касец, дождж, мех, снег, бусел.**

| Скл. | Аснова | | | |
|---|---|---|---|---|
| | на цвёрды зычны | на мяккі зычны | на зацвярдзелы зычны | на ***г***, ***к***, ***х*** |
| **Н.** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| **Р.** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**3.** Прачытай. Раскрый дужкі і запішы.

У (чырвань) ________________ ранішніх промняў сонца растапіла іней, але ранейшай (прыгажосць) _______ _____________ дубу не вярнула *(Паводле Н. Мінкевіч.)*

**4.** Прачытай. Устаў прапушчаныя канчаткі.

І залатая рыбка, а гэта была яна, знікла ў рачной плын_.

Сваім дзіцячым сэрцам Ігнатка адчуваў, што ўсё гэта дробяз_.

На далон_ застаўся толькі пах рыбіны. *(Паводле С. Давідовіча.)*

✶ Растлумач іх напісанне.

_______________________________________________

_______________________________________________

**5.** У спалучэннях слоў устаў прапушчаныя канчаткі. Абазнач склон назоўнікаў.

Уцякаў ад рыс_; не ведаў строгасц_; даручыў моладз_; даў месца кожнай рэч_; не ставала прыгажосц_; жыў на поўнач_.

### ✎ *Арфаграфічная хвілінка*

Раскрый дужкі: святкавалі (у)ле́тку.

## ***Правер сябе***

1. Адзнач «✓» прадаўжэнне выказвання.

Канчатак *-ы* ў родным, давальным і месным склонах маюць назоўнікі 3-га скланення з асновай …

☐ на цвёрды зычны;

☐ на мяккі зычны;

☐ на зацвярдзелы зычны.

2. Адзнач «✓» радок, у якім назоўнікі маюць форму роднага склону.

☐ Працаваў на верфі, не да сытасці, бегаў каля мышы;

☐ злез з печы, не забываў аб адказнасці, не зважаў на дробязь;

☐ няма солі, не адчуваў варожасці, жыў каля Нарачы.

3. Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова? Адзнач «✓».

Хлопчык ускочыў **з крэсла**.

☐ Дзейнікам; ☐ даданым членам; ☐ выказнікам.

4. Адзнач «✓» радок, у назоўніках якога трэба ўставіць канчатак ***-і***.

☐ Без любов.., не было стараннасц.., аб каштоўнай рэч..;

духмянасцю (дыхаць) ____________ паветра. Сонейка (свяціць) ______________ усё ярчэй.

✶ Вызначы спражэнне дзеясловаў.

***Памятай!*** У дзеясловах у неазначальнай форме нельга выдзеліць канчаткі; ***-ць***, ***-ці***, ***-чы*** – гэта суфіксы.

**2.** Змяні дзеясловы па ўзоры. Запішы. Абазнач канчаткі. Вызначы лік, асобу і спражэнне дзеясловаў.

**Шукаць – шукае** (адз. л., 3 ас., I спр.)

рыхтаваць – ____________________(_____л., ____ас., __спр.)

адказваць – ____________________(_____л., ____ас., __спр.)

збіраць – ______________________(_____л., ____ас., __спр.)

маляваць – _____________________(_____л., ____ас., __спр.)

насіць – _______________________(_____л., ____ас., __спр.)

лячыць – ______________________(_____л., ____ас., __спр.)

вазіць – _______________________(_____л., ____ас., __спр.)

**3.** Прачытай дзеясловы. Запішы іх у два слупкі. Абазнач канчаткі.

Тчэ, змятае, аб’язджае, напіліць, намочыць, памые, адступіць, гучыць, звініць, надзене, убачыць, свеціць, мяце, нарэжа.

| I спражэнне | II спражэнне |
| --- | --- |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

## ***Арфаграфічная хвілінка***

Устаў прапушчаныя літары: ме́н..шы кавалак, аб'я..джа́ць дарогу, знаходзіцца ..ве́рсе.

## ***Правер сябе***

**1.** Адзнач «✓» правільнае выказванне.

- ☐ Дзеясловы неазначальнай формы маюць канчаткі -***ць***, -***ці***, -***чы***.
- ☐ У дзеясловах неазначальнай формы нельга выдзеліць канчаткі, яны маюць суфіксы -***ць***, -***ці***, -***чы***.
- ☐ У дзеясловах неазначальнай формы нельга выдзеліць канчаткі і суфіксы.

2. Адзнач «✓» сказ, у якім дзеясловы выкарыстаны ў форме будучага часу.

- ☐ На старым пні сядзела маленькая яшчарка.
- ☐ Яшчарка грэецца пад летнім сонейкам.
- ☐ Хутка хмарка закрые сонейка і яшчарка схаваецца.

3. Адзнач «✓» радок з дзеясловамі толькі II спражэння.

- ☐ Пазірае, смяецца, крычым;
- ☐ глядзім, весялімся, бачыце;
- ☐ сябруеце, трымае, накорміце.

4. Як змяняюцца дзеясловы прошлага часу? Адзнач «✓».

- ☐ Па асобах і ліках;
- ☐ па родах і ліках;
- ☐ па ліках і спражэнню.

5. Як змяняюцца дзеясловы цяперашняга і будучага часу? Адзнач «✓».

- ☐ Па родах і ліках;
- ☐ па родах і асобах;
- ☐ па ліках і асобах.